WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 САКАВІКА 2010 г. АЎТОРАК
№ 47 (26655)
Кошт 650 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

## ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ, КАБ ЛЕПШ БАЧЫЦЬ?

Як захаваць здароўе вачэй пры сучасных зрокавых перагрузках? Што рабіць, калі зрок пачаў падаць? Ці ўплывае спадчыннасць на вастрыню зроку? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа **кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі БелМАПА Галіна Раманаўна СЕМАК.**

«Прамая лінія» з яе ўдзелам пройдзе **23 сакавіка, у аўторак, з 15.00 да 16.30 на нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна пакінуць **па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).**

## НІЖЭЙ ЗАРОБАК — МЕНШ «ПЕНСІЙНЫ ВЫЛІК»?

Сяргей ГРЫБ

**Чытачка «Звязды» з Мінска, пенсіянерка Кацярына Федасеева выгашала ўладкавацца на грамадзянска-прававым дагаворы гардэробшчыцай — паводле яе слоў, не столькі дзеля грошай, колькі дзеля магчымасці заставацца ў «рытме жыцця». Заробак і сапраўды аказаўся невялікім — за 10 гадзін працы ў мінулым месяцы атрымалася прыкладна 23 тысячы рублёў. Аднак праблема ўзнікла не з гэтым. Высветлілася: у сувязі з індывідуальным каэфіцыентам 1,35 з пенсіі быў зроблены вылік — каля 7 тысяч. «Ці павінны рабіць вылічэнні з улікам таго, што я была занятая па дагаворы падраду, і ўвогуле, ці правільна, што праводзяцца вылікі, не зважаючы на тое, колькі зараблае пенсіянер?» — запыталася Кацярына Міхайлаўна.**

Сітуацыя падалася давалі неадназначнай. Закон «Аб пенсійным забеспячэнні» вызначае: пенсіі працуючым пенсіянерам выплачваюцца не больш чым з індывідуальным каэфіцыентам 1,3. Прычым тут няма ніякай розніцы, адбылося ўладкаванне на ўмовах працоўнага або грамадзянска-прававога дагавору, выключэнне з агульнага правіла робіцца на сутнасці адно — абмежаванне па каэфіцыенце не датычыцца работнікаў, якія заняты непасрэдна ў вытворчасці сельгаспрадукцыі. І ўсё ж, наконт супастаўлення памеру заробку і памеру пенсійнага выліку ўзнікаюць пытанні, і да таго ж — не толькі ў нашай чытачкі з Мінска.

— Сёння абмежаванні на выплатах пенсій, па сутнасці, арыентуюцца на ранейшы даход, і тут можна пагадзіцца: было б больш правільна, калі б адбывалася арыентацыя на даход цяперашні, — заўважыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна КАРАЛЁВА.** — Варта ўзгадаць, што ў тыя ж савецкія часы адыгрываў ролю не каэфіцыент, а сукупныя (пенсія плюс зарплата) выплаты — у выніку пенсійныя абмежаванні ў большай ступені датычыліся тых, хто атрымліваў высокую зарплату. І, як падаецца, такі падыход быў больш справядлівым, таму мы сапраўды вывучаем магчымасці змянення цяперашняга заканадаўства, каб у будучым зменшыць абмежаванні для пенсіянераў, якія маюць нізкі або часовы даход. Зрэшты, варта адразу заўважыць: тэма гэта надзвычай далікатная, вызначыцца з кампраміснымі варыянтамі тут вельмі складана, і для падрыхтоўкі канкрэтных прапаноў спатрэбіцца час.

Транспартная філасофія

# ЧУЖОЕ ЖЫЦЦЁ, ці Як я знайшла сябе



**Прайшло два месяцы з таго часу, як мяне збіла машына. Аналізую і пакрысе пачынаю разумець, для чаго гэта здарылася са мной. Першае — самае відавочнае.**

Аварыя адбылася ў прыгарадзе Мінска, у Бараўлянах. Там знаходзіцца дзіцячы анкагематалагічны цэнтр. З яго я, уласна кажучы, і ехала. Больш за тры гады таму ўпершыню я трапіла туды з групай валанцёраў. І не змагла больш не ездзіць.

Так часта бывае: калі Гасподзь у нечым абмяжоўвае, то Ён адорвае ў іншым. Дзеці ў цэнтры рана сталеюць, яны разумеюць і адчуваюць, яны мудрэюць. Я вучылася ў іх мужнасці, вынослівасці, цярпенню, прозе жыцця і любові да ўсяго, што вакол.

Маім першым сябрам у цэнтры стаў сямнаццацігадовы Дзімка. Я не заўважыла, як пачала жыць яго жыццём. Разам з ім пражывала блокі хіміятэрапіі, аперацыі, перасадку коснага мозгу. Разам з ім радавалася і сумавала. Дзімка ніколі не скардзіўся, не хныкаў, ніколі нічога не прасіў. Але я заўсёды адчувала яго боль, боль фізічны і боль душэўны. Маленькім прасцей хварэць, яны не разумеюць. Дзімка збіраўся быць маракам. Яго няма ўжо два гады.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВО ПАШАНЦАВАЛА!

### МІЛЬЯРДЭР — АДЗІН, МІЛЬЯНЕРАЎ — 383

13 сакавіка ў 421-м тыражы латарэі «Ваша лато» ўпершыню за ўсю гісторыю РУП «Беларуская латарэя» быў разыграны мільярд рублёў.

Як паведаміла **PR-менеджар «Беларускіх латарэй» Ганна КУЛАКОВА,** мільярдэрам стаў жыхар Гомеля або Гомельскай вобласці. Адметна, што гэты тыраж латарэі сабраў таксама рэкордную колькасць мільянераў: паводле слоў спецыяліста прадпрыемства, 383 чалавекі ў гэты вечар выйгралі па 1 мільёну рублёў і больш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### У ВЫХАДНЫЯ ІСТОТНА ПАЦЯПЛЕЕ І ДОЖДЖ. АДНАК УНАЧЫ Ў СЕРАДУ ДА МІНУС 20

На працягу гэтага тыдня анамальны сакавіцкі холад «вытхнецца», і неўзабаве да нас завітае сапраўдная вясна, паведаміў рэдакцыі **начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Разам з тым, у першай палове тыдня яшчэ захаваецца марознае надвор'е, тэмпература ў сераду ўначы будзе складаць мінус 5—12, пры праясненнях да 15—20 марозу, удзень — ад мінус 5 да 2 цяпла, па паўночным усходзе — да мінус 8. А вось з чацвярга надвор'е істотна зменіцца. Аднак і 18 сакавіка амаль паўсюдна яшчэ пройдзе снег, мокры снег, удзень на захадзе чакаецца мокры снег і дождж, месцамі туман і галалёд. Уначы мінус 1—8 градусаў, па ўсходзе — да 10—15 марозу, удзень — ад мінус 3 да 4 цяпла. Істотна цяплей пачне ў пятніцу, калі ўначы будзе ўжо ад мінус 4 да плюс 3, удзень — 1—8 цяпла. Уначы паўсюдна, а ўдзень месцамі чакаецца мокры снег, дождж, у асобных раёнах туман, уначы і раніцай моцны туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Актыўная вясна пачне гаспадарыць менавіта ў выхадныя, калі ападкі месцамі будуць назірацца выключна ўжо ў выглядзе дажджу. У суботу і нядзелю ўначы ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — 1—8, па паўднёвым захадзе — да 11 цяпла. Сіноптыкі прагназуюць, што ў гэтыя дні ў заходніх рэгіёнах пачнецца актыўная паводка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### УЦЕКАЧА ЗНАЙШЛІ Ў... КАНАЛІЗАЦЫЙНЫМ КАЛЕКТАРЫ

**56-гадовы рэцыдывіст Анатоль Кудзелка быў выяўлены ў... каналізацыйным калектары, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Як паведамляла ўжо «Звязда», неаднаразова судзімы А. Кудзелка ўцёк з-пад варты ў ноч на 10 сакавіка з лідскай бальніцы, дзе знаходзіўся на лячэнні пасля аперацыі на апендыцыт. Каля 1 гадзіны 30 хвілін 13 сакавіка яго затрымалі ўчастковыя інспектары Лідскага райаддзела міліцыі ў мікрараёне Слабада. Уцякач змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання і будзе адказваць у тым ліку і за пабег.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### МОЦНЫ ПОЛ МЕНШ ЖЫВЕ І... ДАЎЖЭЙ ПРАЦУЕ

**У нашай краіне на 100 жанчын, якім больш за 60 гадоў, прыпадае 52 мужчыны. А ва ўзросце пасля 80 колькасць прадстаўнікоў моцнай паловы зніжаецца да 29.**

Паводле інфармацыі аддзела народанасельніцтва Дэпартамента ААН па эканамічных і сацыяльных пытаннях, чаканая працягласць жыцця пасля 60 гадоў для беларускіх жанчын складае 19 гадоў, для мужчын — 13. У Фінляндыі, напрыклад, размова ідзе адпаведна пра 25 і 20 гадоў, Ірландыі — 24 і 20, Даніі — 23 і 20.

У шлюбе пражывае каля 40 працэнтаў пажылых суайчынніц і 80 працэнтаў іх аднагодкаў-мужчын. Працуе ў згаданым узросце кожны дзясяты беларускі мужчына і ўсяго 3 працэнты нашых жанчын.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### НАСАЛІЎ ЖОНЦЫ «МІНІРАВАННЕМ»

**14 сакавіка 30-гадовы магілёвец паведаміў пра выбух, які адбудзецца ў маршрутным аўтобусе «Магілёў—Смаленск».**

Мужчына прачнуўся пасля сваркі з жонкай: жанчыны дома не было, і муж вырашыў, што яна паехала да маці ў Смаленск. Пасля ранішняй выпіўкі ён моцна раззлаваўся і проста з хатняга тэлефона набраў «102» з паведамленнем аб мініраванні. У гэты час маршрутны аўтобус набліжаўся да Смаленска. Расіяне праверылі яго, але ніякага выбуховага прыстасавання не знайшлі. Дарэчы, пасажырамі ехалі 6 чалавек, і сярод іх жонкі чалавека, які паведаміў пра бомбу, не было. Жанчына гэтым часам знаходзілася ў сваіх магілёўскіх сваякоў і ў Смаленск не збіралася. Як паведаміла прэс-служба Магілёўскага УУС, мужчына, які нідзе не працуе і раней быў судзімы, затрыманы.

**Алена КАЗЛОВА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

Да ведама

## З САКАВІКА 2011 ГОДА КІРОЎЦАЎ З ПРАВАМІ СТАРОГА ЎЗОРУ Ў ЕЎРОПУ НЕ ПУСЦЯЦЬ

**З 29 сакавіка наступнага года, пасля таго як уступяць у сілу папраўкі ў еўрапейскую Канвенцыю аб дарожным руху, пасведчанні кіроўцы, якія выдаюцца зараз на тэрыторыі Беларусі, не будуць прызнавацца іншымі краінамі. Для ўезду ў Еўропу кіроўцам трэба будзе мець правы новага ўзору. Апошнія ў Беларусі, як плануецца, пачнуць выдаваць ужо сёлета, прыблізна ў ліпені.**

Фота БЕЛТА.





— Мы ўжо распрацавалі ўзор новага пасведчання кіроўцы, (на фота), — расказаў **старшы інспектар па асобых даручэннях аддзела рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці і тэхнагляду УДАІ МУС Беларусі Дзмітрый ГАРЫНОВІЧ.** — Яно будзе ўяўляць сабой пластыкавую картку накшталт банкаўскай. На новых правах размесціцца фотаздымак уладальніка, яго подпіс, дата і месца нараджэння, з'явяцца дадатковыя катэгорыі. Пасведчанне будзе забяспечана сучаснымі элементамі аховы, галаграмамі. У афармленні гэтага дакумента будзе выкарыстоўвацца англійская, беларуская і руская мова. Арыенціровачны кошт новых правоў складзе 1 базавую велічыню (зараз кошт пасведчання — 0,5 базавай).

Абменьвацца пасведчанні будуць паэтапна. Калі ў кіроўцы правы сапраўдныя да, напрыклад, 2013 года, то ДАІ не будзе паскараць іх абмен. Аўтаўладальнік зможа спакойна ездзіць з правамі старога ўзору, але з сакавіка 2011 года — толькі ў межах Беларусі. Калі ж будзе неабходна памяняць старое пасведчанне на новае раней, каб выехаць за мяжу, гэта можна будзе зрабіць у рэгістрацыйна-экзаменацыйным падраздзяленні ДАІ па месцы рэгістрацыі. Пры сабе патрэбна мець старое пасведчанне, пашпарт, медыцынскую даведку і дакумент, які пацвярджае ўнясенне аплаты. Заяву кіроўца будзе пісаць на месцы.

**Надзея ДРЫЛА.**

Гучная справа

## 202 СКРАДЗЕНЫЯ МІЛЬЁНЫ — НА АДПАЧЫНАК...

**Выкрытыя злачынцы, якія скралі грошы з банкаматаў у Мінску і Клічаўскім раёне.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, згаданыя злачынствы, а таксама няўдалыя спробы ўзлому банкаматаў у сталіцы і Пухавіцкім раёне — на рахунку трох груп, якія не былі паміж сабой звязаныя. У прыватнасці, у выкраданні 25 студзеня гэтага года 202 мільёнаў беларускіх рублёў з банкамата па сталічнай вуліцы Ротмістрава падазраюцца 31-гадовы мінчанін і 38-гадовы пінчук, які пражывае ў Барысаве. Між іншым, грошы яны паспелі патраціць на адпачынак у Егіпце, вяртанне даўгоў, куплю аўтамабіля і нерухомасці. Акрамя таго, на сумленні крымінальнага «дуэта» і няўдалая спроба ўзлому леташнім жніўнем банкамата па Партызанскім праспекце ў Мінску: зладзюжкі ўсю ноч спрабавалі ўскрыць грашовы сейф, але сышлі ні з чым. Абодва цяпер знаходзяцца ў ізалятары часовага ўтрымання.

Таксама затрыманыя чацвёра жыхароў Бабруйска, якія ў вёсцы Арэхаўка Клічаўскага раёна 11 лютага пранікі ў адміністрацыйны будынак саўгаса «Дабраволец» і з банкамата выкралі 28 мільёнаў рублёў. Між іншым, на рахунку згаданых злачынцаў і серыя крадзяжоў у гэтым рэгіёне з паштовых аддзяленняў сувязі і магазінаў. Акрамя таго, затрыманыя двое ўдзельнікаў злачыннай групы, якія напракудзілі ў Пухавіцкім раёне. У ноч на 6 лютага яны спрабавалі ўскрыць банкамат у магазіне вёскі Пухавічы. Аднак у іх нічога не атрымалася. Тады праз дзесяць дзён яны пранікі ў аграрна-тэхнічны каледж пасёлка Мар'іна, дзе звязалі вартаўніка і хацелі ўзламаць банкамат — таксама нічога не выйшла. Цяпер устанаўліваецца, ці маюць гэтыя зладзеі дачыненне да іншых злачынстваў, а таксама магчымыя саўдзельнікі падазроных.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ДВА АКІЯНЫ ДАШЫНЫХ УСМЕШАК

**У фінскім Канціялахці на першым пасляалімпійскім этапе Кубка свету па біятлоне беларуска Дар'я Домрачава ў бліскучым стылі выйграла адразу дзве гонкі — спрынт і гонку-пераследаванне.**

У прынцыпе, вынесенае ў загаловак параўнанне можна выкарыстоўваць да кожнай гонкі з удзелам Домрачавай — як бы ні складвалася становішча, яна ніколі не падае духам. На мінулых выхадных нашу прыгажуню ў поўнай красе пабачыў увесь біятлонны сусвет, беларуска не проста атрымала сваю першую ў кар'еры перамогу ў гонцы Кубка свету, але на наступны дзень пацвердзіла высокі статус, нікому не саступіўшы і ў другім запар выступленні.

Між тым, адкрываліся спаборніцтвы змешанай эстафетай, дзе ў зборнай Беларусі таксама былі добрыя шанцы на подыум, але не хапіла зусім трошкі — чацвёртае месца. Праз дзень біятланісты выйшлі на старт спрынтарскіх гонак. Наша Даша праляцела 7 з паловай кіламетраў дыстанцыі за 21 хвіліну і 17 секундаў, не дапусціўшы пры гэтым ніводнага промаху. Галоўныя суперніцы таксама «чыста» адстраляліся, але ўсё ж вымушаныя былі саступіць беларусцы. Адставанне сярэбранага прызёра расіянкі Вольгі Зайцавай — 8 секундаў, а «бронзавай» немкі Каці Вільхельм — 13.

Кожная з гэтых секундаў была дарагая яшчэ і тым, што з'яўлялася стартавым задзелам у наступнай гонцы. У нядзелю Домрачава была не настолькі хуткай (безумоўна, адносна сябе самой), як у спрынце, але высокая якасць стральбы дапамагла ёй да апошняга быць сярод самых мацнейшых. І нервы не падвялі беларуску — у той час, калі суперніцы мазалі, яна ў добрым тэмпе закрыла ўсе 5 мішэняў і паляцела на фініш.

Некалькі слоў і пра мужчынскую палову каманды. На жаль, яна не змагла паказаць добрых вынікаў — лепшы паказчык у сярэбранага прызёра Ванкувера Сяргея Новікава, які са свайго саракавога месца ў спрынце змог падняцца на 28-е ў праследаванні.

**Яўген ВАРАКСА.**



Фота sports.ru

Минский городской центр недвижимости

### УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 19 апреля 2010 года проводит открытый аукцион по продаже единым лотом имущества УИПЧП «Сивва-М», расположенного по адресу: Минская обл., Логойский р-н, г\п Плещеницы, ул. Партизанская, д. 26. В состав лота входит следующее имущество:

| № п/п | Наименование объекта |
|---|---|
| 1. | Одноэтажный кирпичный материальный склад общей площадью 345,7 кв. м, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 601/С-14226) |
| 2. | Одноэтажная кирпичная проходная общей площадью 9,5 кв. м (здание неустановленного назначение, инв. номер 601/С-14269) |

На имущество, входящее в состав лота, обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства.

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке с кадастровым номером 623255700001001557 (присвоен предварительно).

Начальная цена лота – 68 229 050 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 6 800 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **19 апреля 2010 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15 марта 2010 г. по 15 апреля 2010 г.** в рабочие дни **с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45)** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by.**

Як нас дураць

## БАГАЦЕЛІ НА ПЕНСІЯНЕРАХ

**Махляры на вачах у пенсіянераў «знаходзілі» кашалёк, пасля чаго старыя «гублялі» частку атрыманай пенсіі**

Наша газета ўжо паведамляла пра такія выпадкі. У прыватнасці, у лютым з такімі махлярамі сутыкнуўся 91-гадовы пенсіянер з Мінска, якому «знаёмства» з прайдзісветамі каштавала, між іншым, усёй пенсіі. Размова ідзе пра так званых «катлетнікаў», якія на вачах у «аблюбаванага» пенсіянера знаходзяць нібыта згубленты кімсьці кашалёк. Калі адзін з крымінальнікаў прапануе чалавеку раздзяліць здабычу, з'яўляецца другі — «гаспадар кашалька», задачай якога з'яўляецца вымусіць пенсіянера перадаць свае грошы ў рукі злачынцаў нібыта для таго, каб палічыць іх: маўляў, з кашалька знікла «энная» сума. І як толькі чужыя грошы трапляюць у рукі да спрытнюгі, той прафесійна, незаўважна для пацярпелага, «канфіскоўвае» істотную частку купюр...

Дык вось, група маладых людзей, якія спецыялізаваліся на такіх вось «катлетах», паводле звестак **прэс-афіцэра Заводскага РУУС Тамары РУЛІНСКАЙ,** затрыманая сталічнымі праваахоўнікамі. Толькі ў адным Заводскім раёне сталіцы з пачатку года пяць чалавек пацярпела ад падобнага роду махляроў. Між іншым, двое з пацярпелых ужо апазналі сваіх крыўдзіцеляў. Цяпер следчыя правяраюць, ці маюць дачыненне затрыманыя да аналагічных злачынстваў у іншых раёнах горада.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АГРОСТРОЙФИРМА ПМК-74-НАЛИБОКИ» (ПРОДАВЕЦ) КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

### ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания общежития, об. пл. 317,5 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, Столбцовский район, д. Налибоки, ул. Гостинная, 10.** Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 34 847 400 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.11.2009. Аукцион состоится **31.03.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 30.03.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

### ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

вносит изменение в извещение о проведении аукциона, намеченного на 15 апреля 2010 года в 11.00 по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона, опубликованное в газете «Звязда» от 12 марта 2010 года № 45:

**Условия использования земельных участков по лотам №№1–3:** для размещения объектов производственного назначения.

## Паркоўка ў Мінску зноў стане платнай

**У Мінску ў хуткім часе зноў будзе ўведзена плата за паркоўку на стаянках горада. Аб гэтым паведаміў БЕЛТА дырэктар УП «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» Аляксандр КАНАШ.**

«З 1 студзеня гэтага года ў Мінску быў адменены мясцовы збор за паркоўку на стаянках горада, — нагадаў субяседнік. — Але 9 сакавіка выйшаў указ № 143, які замест мясцовага збору ўвёў плату за стаянку на паркоўцы. Яе памер вызначаецца рашэннем Мінгарвыканкама. Цяпер гэты дакумент знаходзіцца на зацвярджэнні». Пры гэтым Аляксандр Канаш падкрэсліў, што тарыфы будуць не вышэйшыя за ранейшыя.

### БЯСПРАЎНЫ КІРОЎЦА ЎЕХАЎ У ДРЭВА...

У Мастоўскім раёне каля гадзіны ночы 19-гадовы хлопец, у якога ніколі не было пасведчання кіроўцы, не справіўся з кіраваннем «Опеля» і наехаў на прыдарожнае дрэва. Чацвярых яго пасажыраў, якім было ад 17 да 24 гадоў, з траўмамі даставілі ў бальніцу. Адзін з іх, 21-гадовы, праз некалькі гадзін памёр.

**Надзея ДРЫЛА.**

Минский городской центр недвижимости

### УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 22 апреля 2010 г. проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства изолированного помещения (гаража), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Олешева, 18, пом. 95 (гаражный массив № 1). Общая площадь гаража 34,2 кв.м. Инвентарный номер 500/D-63016. Начальная цена – 21 356 000 рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 2 100 000 рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **22 апреля 2010 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **17 марта 2010 г. по 19 апреля 2010 г.** в рабочие дни с 9.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by.**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛТОРГСТРОЙ» (ПРОДАВЕЦ)

### ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объектов недвижимости в составе: **Лот № 1:** комплекс зданий и сооружений, расположенных по адресу: **г. Новополоцк, пер. Рижский, 12**, в составе: здание склада-модуля, об. пл. 927,7 кв.м (корп. 3); административно-бытовой корпус, об. пл. 527,8 кв.м; здание ведомственной охраны со складским помещением, об. пл. 51,4 кв.м (корп. 2); здание склада, об. пл. 152,3 кв.м (корп. 5); пристройка к сторожке, об. пл. 106,0 кв.м (корп. 1); здание пилорамы, об. пл. 83,0 (корп. 4); КТП-25; сети водопроводные, сети канализационные. Начальная цена с НДС – 1 429 745 646 бел. рублей. Площадь земельного участка – 1.4945 га. **Лот № 2:** трансформаторная подстанция, об. пл. 56,3 кв.м, расположенная по адресу: **г. Брест, ул. Красногвардейская, 129.** Начальная цена с НДС – 55 882 080 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,0103 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 20 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 дней со дня проведения аукциона, *если иное не предусмотрено договором купли-продажи.* Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **20.04.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.04.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.03.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 961,00 | 1 чэшская крона | 159,37 |
| ▲ 1 еўра | 4 068,12 | 1 польскі злоты | 1 042,06 |
| 1 латвійскі лат | 5 736,70 | ▲ 1 расійскі рубель | 100,94 |
| 1 літоўскі літ | 1 176,47 | 1 украінская грыўня | 371,40 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 29,3353 |
| 10 UAH | 36,5549 |
| 1000 BYR | 9,9072 |
| EUR | 40,3272 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

# «У БЕЛАРУСІ НЯМА НІВОДНАГА АСАБЛІВА НЕБЯСПЕЧНАГА РЭЦЫДЫВІСТА»

**БОЛЬШ за сорак працэнтаў усіх леташніх злачынстваў — «справа рук» людзей з непагашанымі судзімасцямі. Адны праваахоўнікі сцвярджаюць, што гэта лічба не павінна пужаць: маўляў, калі рэцыдывістаў шмат, значыць у злачынную сферу не ўцягваюцца новыя людзі. Іншыя ж пярэчаць: у цывілізаваным грамадстве не месца вялікай устойлівай групе, якая ўпэўнена коціцца па нахіленай. Але і тыя, і другія лічаць, што, каб вярнуць былога вязня да нармальнага жыцця, недастаткова ўзяць яго на асаблівы кантроль. Чалавеку, які спатыкаўся не адзін раз, патрэбна рэальная падтрымка, бо паставіць крыж на змрочным мінулым, згадзіцеся, у адзіночку не так лёгка...**

**Пра беларускіх рэцыдывістаў размаўляем з намеснікамі начальніка ўпраўлення наглядна-выканаўчай дзейнасці МУС Беларусі Сяргеем АЛЯШКЕВІЧАМ і Андрэем ГВАЕМ.**

***— Раскажыце, як рэцыдывісты сёння парушаюць закон?***

— Час мацёрых бандытаў з нажамі і кастэтамі ў кішэнях даўно мінуў. Сёння ў Беларусі няма ніводнага асабліва небяспечнага рэцыдывіста. Рост жа адбыўся за кошт злачынстваў, якія не з'яўляюцца небяспечнымі для грамадства. Напрыклад, сярод рэцыдываў нямала крадзяжоў і ўхіленняў ад адбывання пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі. Прынамсі, асуджаны да абмежавання волі абавязаны выконваць вызначаны рэжым (у акрэслены час знаходзіцца дома, перыядычна з'яўляцца для рэгістрацыі ў органы ўнутраных спраў). Натуральна, знаходзяцца такія асуджаныя, якія парушаюць гэтыя і іншыя правілы. Пасля трох парушэнняў выносіцца афіцыйнае папярэджанне, а на чацвёрты раз заводзіцца крымінальная справа за ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі, якая прадугледжвае да трох гадоў турэмнага зняволення. У гэтым выпадку чалавек таксама лічацца рэцыдывістам.

***— Старшыня Вярхоўнага Суда Беларусі Валянцін Сукала, падводзячы вынікі за 2009 год, канстатаваў, што толькі летась за ўхіленне ад абмежавання волі альбо папраўчых работ па краіне асуджана каля 6 тысяч чалавек. Ён назваў гэты від пакарання відавочна неэфектыўным. І падтрымаў ініцыятыву Генпракуратуры замяніць крымінальную адказнасць за некаторыя злачынствы на вялікія грашовыя штрафы. Такога роду санкцыі ўжо даўно прымяняюцца ў ЗША, па такім шляху пайшлі краіны Балтыі...***

— Прапанова Генеральнай пракуратуры разглядаецца цяпер на найвышэйшым узроўні. Фінансавае пакаранне, мяркуем, дасць шанц чалавеку адумацца без ізаляцыі ад грамадства. Безумоўна, нехта яго своечасова выкарыстае, а нехта працягне парушаць закон і правядзе вялікую частку жыцця ў турме. Шмат залежыць ад самога чалавека. Больш за тое, істотныя штрафы дадуць магчымасць не страчваць дзяржаўныя грошы на ўтрыманне за кратамі тых людзей, якія баяцца ўдару па кішэні не менш, чым папраўчай калоніі. Мы, у сваю чаргу, лічым, што не заўсёды мэтазгодна канцэнтравацца на ізаляцыі. Лепш частку грошай, якія ідуць на ўтрыманне асуджаных, перанакіраваць на рэсацыялізацыю людзей, якія выйшлі на волю. Ад гэтага ўсе толькі выйграюць.

***— Вы сказалі, што значную частку рэцыдываў складаюць крадзяжы. Што прымушае чалавека, які ўжо зведаў турэмныя будні, зноў і зноў браць чужое?***

— Што датычыцца паўторных крадзяжоў, то яны ў многім звязаныя з праблемамі рэсацыялізацыі тых, хто толькі што адбыў пакаранне. Пасля турмы чалавек, як правіла, вяртаецца ў асяроддзе, у якім ён знаходзіўся да гэтага і якое прывяло яго да турмы. Не заўсёды ён можа яму супрацьстаяць, у адзіночку справіцца з тымі праблемамі, якія ўзнікаюць на волі. І, як вынік, вырашае іх старым спосабам: прысвойвае чужыя рэчы і грошы. А потым зноў за краты. Большасць рэцыдывістаў, пра гэта сведчыць статыстыка, выйшаўшы на волю, толькі тым і займаліся, што пілі ды білі лынды. Прычыны дзве: часам самі не хочуць працаваць, а часам і адпаведныя органы фармальна ставяцца да іх працаўладкавання...

***— Між тым, практыка краін Шэнгенскай зоны паказвае, што многіх былых вязняў можна прывучыць зарабляць на жыццё законнымі спосабамі. Для гэтага іх накіроўваюць на прафесійнае навучанне, замацоўваюць за імі псіхолагаў...***

— Падобны спосаб папярэджання рэцыдываў на заканадаўчым узроўні (закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў») у нашай краіне быў прыняты яшчэ ў лютым 2009 года. Праўда, пакуль што ў Беларусі ёсць толькі пяць Цэнтраў адаптацыі для тых, хто вызваліўся з месцаў зняволення: у Мінску, Пінску, Магілёве, Гомелі і Гродне. Мы ж лічым, што падобныя ўстановы павінны быць, як мінімум, у кожным раённым цэнтры. Цяпер на ўзроўні райвыканкамаў якраз і вырашаецца гэтае пытанне. Бо, і гэта не сакрэт, менавіта ў малых населеных пунктах найбольш праблематычна ўладкавацца на працу: там для ўчарашніх судзімых браніруецца недастатковая колькасць месцаў.

***— Атрымліваецца, што не ў кожным населеным пункце чалавеку, які выйшаў на волю, аказваецца неабходная падтрымка?***

— Пры выканкамах у кожным раёне ёсць цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у абавязкі якіх уваходзіць, у тым ліку, і клопат аб людзях, якія вярнуліся з турмы. У прыватнасці, яны павінны дапамагчы ім у пошуку працоўнага месца, аформіць прапіску, аднавіць страчаныя дакументы. Нельга сказаць, што гэта не робіцца. Робіцца, але не паўсюль на поўную моц. Значна падтрымлівае сацыяльных работнікаў БРСМ. Актывісты прыцягваюць моладзь, якая аступілася, да культурна-масавых мерапрыемстваў, наведваюць іх па месцы вучобы, працы.

***— 80 працэнтаў злачынстваў у Беларусі здзяйсняецца нападпітку. Магчыма, у такім выпадку трэба забараніць прадаваць алкаголь у крамах тым, хто стаіць на ўліку ў міліцыі, наогул?***

— Аднымі забаронамі справе не дапаможаш. Тым больш, паверце, на сёння распрацаваны дастатковы комплекс мераў, арыентаваны на прафілактыку рэцыдыўнай злачыннасці. Галоўная задача на сёння — больш актыўна іх прымяняць на практыцы. У прыватнасці, папярэджваць злачынствы міліцыі павінны дапамагаць Саветы прафілактыкі, якія ёсць на ўсіх прадпрыемствах і пунктах аховы правапарадку. А ў нас як большасць наймальнікаў працуе?.. Ходзіць чалавек на працу і добра. Але варта яму ўвайсці ў запой, як наймальнік, не раздумваючы, выкідвае яго на вуліцу. Ніхто не капаецца ў прычынах гэтага запою. І нікога не цікавіць, што з гэтым чалавекам будзе далей без зарплаты...

**Размаўляла Надзея ДРЫЛА.**

**P.S.** *Рэпартаж са сталічнага Цэнтра сацыяльнай адаптацыі раней судзімых чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў.*

# ГАНДЛЁВЫЯ СЕТКІ Ў РАЁНАХ СТАЛІЦЫ МОГУЦЬ СТАЦЬ ДАМІНУЮЧЫМІ

## Міністэрства гандлю прапануе перагледзець антыманапольнае заканадаўства



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**МІНІСТЭРСТВА гандлю правяло аналіз развіцця гандлёвых сетак у Мінску. Было ўстаноўлена, што на тэрыторыі горада найбольшая колькасць гандлёвых плошчаў (звыш 3 тысяч квадратных метраў) знаходзіцца ў карыстанні 17 прадпрыемстваў. Высветлілася, што шэраг аб'ектаў розных уласнікаў вядуць гандаль пад адной шыльдай (маркай). Напрыклад, пад маркай «Рублёўскі» ў снежні мінулага года ў Мінску вялі рэалізацыю тавараў 27 гандлёвых аб'ектаў, што належалі сямі розным уласнікам. Пад шыльдай «Суседзі» ў сталіцы працавалі 25 гандлёвых аб'ектаў, гаспадарамі якіх былі шэсць уласнікаў. Агульная гандлёвая плошча аб'ектаў, што вядуць у Мінску продаж тавараў пад шыльдай «Рублёўскі», складае каля 14,3 тысячы квадратных метраў (2,3 працэнта ад агульнай гандлёвай плошчы крамаў і гандлёвых сетак, размешчаных у Мінску), «Суседзі» — 10,7 тысячы квадратных метраў (1,7 працэнта).**

Увогуле, у адпаведнасці з ведамаснай справаздачнасцю, у сталіцы па стане на 1 студзеня 2010 года агульная гандлёвая плошча крамаў і гандлёвых цэнтраў складала каля 614,2 тысячы квадратных метраў. Пры гэтым агульны рознічны тавараабарот гандлёвай сеткі па Мінску за 2009 год склаў 11,3 трыльёна рублёў.

У краіне на згаданую дату забяспечанасць гандлёвымі плошчамі складала 363,6 тысячы квадратных метраў на тысячу чалавек (у Мінску — 338,4 квадратнага метра, у Брэсцкай вобласці — 335,5 «квадрата», у Віцебскай — 367,9, у Гомельскай — 344, у Гродзенскай — 344,9, у Мінскай — 462,3, у Магілёўскай вобласці — 350,9 квадратнага метра).

Найбольшая ўдзельная вага ў агульным аб'ёме тавараабароту за мінулы год па сталіцы прыпадала на гандлёвыя аб'екты, што вялі сваю дзейнасць пад маркамі «Гіпа», «Еўраопт», «Пяты элемент» і г.д. Пры гэтым асобныя гандлёвыя сеткі развіваюцца ў асноўным у пэўных раёнах сталіцы (ААТ «Падзея» — у Савецкім раёне, ААТ «Азарэнне» — У Фрунзенскім, ААТ «Зарына» — у Першамайскім, ААТ «Пастгандаль» — у Партызанскім, УП «Жывінка» — у Маскоўскім раёне). Як адзначаюць у Міністэрстве гандлю, доля гэтых арганізацый у агульным аб'ёме тавараабароту харчовых тавараў у межах адпаведных раёнаў горада пакрысе робіцца значнай і з цягам часу можа перавысіць вызначаную заканадаўствам велічыню, неабходную для прызнання становішча суб'екта гаспадарання на таварным рынку дамінуючым.

У адпаведнасці з дзейным у краіне антыманапольным заканадаўствам, дамінуючым прызнаецца становішча суб'екта, калі яго доля ў агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту харчовымі таварамі ў межах мясцовага таварнага рынку складае 30 і больш працэнтаў. Разам з тым, дзейнае заканадаўства да геаграфічных межаў мясцовых таварных рынкаў адносіць толькі межы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (вобласць, раён, населены пункт). Пры гэтым, згодна з часткай чацвёртай артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 1998 года «Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні і парадку рашэння пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Рэспублікі Беларусь», раёны ў гарадах не з'яўляюцца самастойнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі. У гэтай сувязі пераважнае становішча суб'екта гаспадарання на таварным рынку пэўнага раёна горада не можа быць прызнаным як дамінуючае, а да самога аб'екта не могуць быць прынятымі меры антыманапольнага рэгулявання. Улічваючы вышэйсказанае, а таксама тое, што сітуацыя з развіццём гандлёвых сетак у перспектыве можа негатыўна адбіцца на якасці абслугоўвання насельніцтва, Міністэрства гандлю выступіла з прапановай адрэгуляваць (перагледзець) дзейнае ў Рэспубліцы Беларусь заканадаўства ў галіне антыманапольнага рэгулявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**





## Сувенір ад фрыца

Аднойчы завітаў я да сваёй аднавяскоўкі Аўдоцці Ціханаўны Задарожнай. Яна якраз на двары была, курэй карміла. Ды з чаго — я вачам не паверыў — з сапраўднай... нямецкай касе.

— Дзе ж ты яе ўзяла? — пытаюся.

— Фрыц прынёс, — адказвае кабета.

— Падараваў, ці як?

— Не, — усміхаецца. — Кінуў... Разам з галавой...

І расказвае мне, пры якіх абставінах.

Значыць, у 43-м савецкія войскі праз нашу Агародню немчуру пагналі, і драпала яна, лічы, без аглядкі. Але ж паскудства пры гэтым нарабіць стараліся.

Вось і ў той дзень пад вечар — бачу ў акно — бяжыць немец да маёй хацінкі і за спінай яго, на рамянях, нейкі бак матляецца. Мой унук з падобнага цяпер каларадскіх жукоў труціць ды хату фарбуе... А тады ў мяне сэрца ў пяткі зайшло — мусіць жа хату маю паліць збіраецца?!

Выбегла я, яец яму ў місачцы суну ды што сілы прашу: «Пан! Пан! Не губі, не палі маю хатку!». А ён павярнуўся да мяне — твар потны, злы — ды як ударыць нагой па місачцы, а потым і па мне... Я і паляцела — потырч. У зямлю. А ён крычыць: «Шнэллер! Шнэллер! Уцякай... Хутчэй».

Не паспела я — побач разарваўся снарад.

Колькі, здранцвеўшы, ляжала, не ведаю. А калі прыйшла ў сябе, бачу — побач са мной і немец той, нежывы.

Спалохалася я, можа, думаю, зараз хаўруснік яго з'явіцца ды скажа, што гэта я забіла. Схавалася, двое сутак на двор не выходзіла. Толькі на трэція...

Бачу, фрыц той як ляжаў, так і ляжыць. Так, думаю, табе і трэба, паганец! Мужык мой, Захар, пяць гадоў да вайны надрываўся, будаваў гэту хату. А ён, бач, спаліць хацеў.

Пайшла да камандзіра (у вёсцы ўжо нашы стаялі), расказала пра ўсё. Ён — ад слова — двух салдацікаў прыслаў. Закапалі яны немца на маім агародзе, д'ябальскую амуніцыю і зброю з сабой забралі, а мне гэту каску пакінулі.

— Навошта? — у іх пытаюся.

А хлопцы вясёлыя. Кажуць:

— Курак карміць будзеце.

Дык я вось і кармлю... Трывалая пасудзіна. Амаль 70 гадоў ужо служыць.

...Ды яшчэ, дадамо, і хай нагадвае: хто прыйдзе да нас з мячом, ад мяча і загіне.

**Сямён Рыгаравіч РУДНІКАЎ,**
*вёска Агароднся, Добрушскі р-н.*

## Усё могуць каралі!

...Хто ў дзяцінстве не марыў займець мапед ці матацыкл? Тым больш, калі ўжо вусікі прабіваюцца і да дзевак цягне — у суседнюю, як правіла, вёску...

Заўважу, асобным шанцавала: некаму бацькі даверылі ўласную тэхніку, некаму куплялі патрыманы альбо нават новы «Мінск» ці «Усход». Але ж яны аўтарытэту не мелі — нават сярод дзяўчат. Іншая рэч «Ява» (ды з каляскай!..), што стаяла на падворку ў Стася!

Стась быў старэйшы за нас, пасля войска, лічы, «кароль». І мы, «світа», вядома ж дапамагалі яму будаваць для «Явы» гараж, што дазваляла паралельна марыць, як у найбліжэйшую суботу, на ёй, мы паедзем на танцы, як, дзякуючы калясцы, больш прыхопім сваіх, а значыць тамтэйшыя дзелуны не адважацца, як раней, нас паганяць...

Аднак, спраўдзіцца гэтым марам быў, як кажуць, не лёс: варта было ў тым гаражы накрыць дах і навесіць дзверы, як на іх з'явіўся замок, а ключ ад яго, як і ключ ад «Явы», апынуліся ў Стасевай маці. Яна, цётка вельмі сур'ёзных памераў, прычапіла іх на шнурок, павесіла на шыю і выцягваць стала толькі раз на тыдзень: у нядзелю Стась вазіў яе альбо да касцёла, альбо на кірмаш, пасля чаго ключы зноў «тапіліся» між грудзей. Стасю ж, каб з'ездзіць на танцы, трэба было па-ранейшаму «садзіцца на хвост» некаму з маладых, што караля, безумоўна ж, зневажала. Таму аднойчы ён заявіў матулі:

— Усё, рухавік прайшоў абкатку — мусова масла мяняць.

Маці хоць-нехаць дала Стасю ключы ад гаража, дзе сын заняўся не толькі маслам, — ён яшчэ балты адкруціў, якімі да матацыкла мацавалася каляска.

Назаўтра ў чарговы раз цётка сабралася ў дарогу. З трудам, але ж уціснулася ў люльку, села. Стась, чыркнуўшы ўключанай перадачай, ірвануў з месца. Маці (у шлеме...)... засталася ў гаражы, на калодцы...

Пасля гэтага сын дні са тры дома не ночыў. Заявіўшыся ж, паставіў ультыматум: калі маці не будзе дазваляць яму карыстацца матацыклам, то ён возьме замуж тройчы ўдовую і бяздзетную Агату. Калі ж будзе, то зможа выбраць маладую, прыгожую і працавітую...

Пасля гэтага на Стасевай «Яве», у суправаджэнні «мінчыкаў» і «Усходаў» мы часцяком сталі наведваць суседнюю вёску. Але, на жаль, нядоўга, бо ў хуткасці кароль аб'явіў, што ўпадабаў дзеўку, мае намер жаніцца.

Перад гэтым ён строга наказаў нам не задзірацца з чужымі хлопцамі. Гэта была, так бы мовіць, апошняя воля караля... Перад няволяй.

**А. ЛІПЕНЬ,** *Іўеўскі раён.*

## На апошнім дыханні

Ваша газета пісала, што 10 сакавіка 1876 года амерыканскі вынаходнік Аляксандр Бел упершыню пагутарыў па тэлефоне. Цяжка сказаць, як, канкрэтна, гэты апарат тады выглядаў, але ж, відавочна, быў з правадамі? Цяпер такія ўжо не ў модзе, цяпер і жук і жаба маюць бяздротавыя. Але ж і такі, звычайны, тэлефон у хаце патрэбны — хоць бы для таго, каб знайсці мабільны: забыўся, дзе паклаў, нумар набраў — пачуеш...

Выратавальная ўласцівасць! Але ж па парадку...

Перад апошнім святам (тры выхадныя былі) мае бацькі рашылі закалоць кабанчыка. Мы з мужам паехалі ім дапамагчы (у тым ліку — і з'есці). Факт, што ў суботу і нядзелю досыць добра папрацавалі, у панядзелак — збіраліся вяртацца ў Мінск: муж, паснедаўшы, выгнаў з гаража машыну, адкрыў капот — узяўся штосьці рамантаваць.

Аднак праз нейкі час (бачу ў акно) шукае ён штось?

Выйшла на вуліцу, пытаюся, каа:

— Ды мабільнік прапаў... Мусіць, з кішэні выпаў?

І дзірку ў ёй паказвае.

Што тут будзеш рабіць?! Удваіх ужо мы сталі ўзірацца ў снег, «абмацваць» яго нагамі і рукамі.

— Трэба пазваніць, — адзавецца! — з'явілася здагадка.

Я збегала ў хату па свой тэлефон і раз, і два, і пяць, і дзесяць «клікнула» па ім мужаў. Марна — ні гуку ў адказ. «Адсырэў, відаць, батарэйка «здохла». Цяпер дакладна канцы», — махнуў рукою мужык.

Настрой быў ушчэнт сапсаваны. І не толькі ў нас. Адчуўшы нядобрае, з хаты выйшлі бацькі, сталі перажываць, казаць: «Успамінай, можа ты яго з хаты не браў? Можа кудысь хадзіў і пакінуў? Можа да цябе нехта падыходзіў і крый Божа скраў?»

На кожнае пытанне муж адказваў: «Не». Гэта значыць, тэлефон пры ім быў, ад машыны ён нікуды не хадзіў (хоць, як высветлілася, забыўся...) і з чужых паблізу нікога не было... Выходзіць — мабільнік той карова языком злізала?! Ды новы, наварочаны, дарагі.

Што ж — нічога не зробіш. Муж, як быццам, змірыўся, махнуў рукой, пайшоў у бок прыбіральні і хаты. Я, убачыўшы яго апушчаныя плечы, не ведала, чым дапамагчы? Хіба яшчэ раз клікнуць — па мабільным?..

Гэта трэба было ўбачыць! Муж стаў (прычым, не апусціўшы правую нагу), насцярожыўся, рэзка павярнуў галаву, упаў на калені і хуценька, па-сабачы, стаў раскопваць снег каля сцежкі.

Праз імгненне ў ягоных руках быў мабільнік!

Які тут жа сціх — батарэйку ў ім мы такі «пасадзілі».

Але гэта ўжо была не бяда.

**Алена М.,** *г. Мінск.*



У пошуках мабільнага.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Кіно ў Баянічах

Баянічы — гэта вёска такая, на Любаншчыне. Адкуль назва ўзялася? Па адной версіі — прашчуры нашы па балоце доўга ішлі, а далей ісці забаяліся, тут аселі. Па другой — яны гаваркія дужа былі: адзін слова, другі слова і байка гатова. Чыя? Ды нічыя, бо баялі старыя, перадавалі маладым, а тыя прыдумлялі новыя. Хоць тут і прыдумляць не трэба, смех само жыццё падказвае.

То ў пяцідзясятыя—шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя тэлевізараў у вёсках яшчэ не было. А кіно палешукі палюбілі. Падшыванцы загадзя афішы развешвалі — якое, калі... І ў той дзень толькі пра яго і гутарка была — работа не работа і гульня не гульня. Прывозілі кіно адзін раз у месяц — поўны клуб гледачоў! Сталі прывозіць раз у тыдзень — таксама. Людзі яшчэ і пад вокнамі стаялі. Дзеці ж усімі праўдамі і няпраўдамі пранікалі ў клуб задоўга да сеанса, зашываліся там дзе толькі можна было, і ўжо тады Бог бацька, як кажуць: прагоніць кіншчык, значыць, прагоніць, а калі ў гуморы ён, то можа ж і пакінуць, сказаўшы:

— Прынясі парачку яец і глядзі.

Дзятва стрымгалоў тады — дамоў і ў куратнік. А там толькі паклады ляжаць, — свежыя яйкі ў хаце. Ускочыш па іх, мамка чаго добрага трапкачом агрэе, а то і дома запрэ, за нянькі пакіне...

Таму хлапчаня хапае тое, што ёсць — хоць паклады і нясецца назад у клуб. Каля дзвярэй аддае кіншчыку плату і замірае ў парозе, гледзячы, як па белым экране ва ўсю сцяну ўжо бягуць дзівосы.

Кінамеханік жа, хоць і бачыў гэтае кіно, глядзеў бы і яшчэ. Каб не ласунак...Шпокае адно яечка, кідае ў рот, потым другое і... Амаль усю бараду яго закрываюць... лапкі ледзь не жывога кураняці...

Кажуць, ён дужа хацеў адлупцаваць хлапчука за такі пачастунак. Ды хіба ўведаеш, каторы прынёс? Кожны ж з іх у вочы глядзіць і божыцца, што не ён, бо з Баянічаў, значыць баіцца. За вочы ж — якраз наадварот, што ён... Бо кожнаму хочацца ў байку патрапіць і героем хадзіць.

**Марыя ДАЙНЕКА,**
*в. Заельнае, Любанскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж...*** *Не першы год, як быццам, рыхтуюцца да друку «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў «Звязды» і пры гэтым, лічы, кожны раз ёсць патрэба зазірнуць у слоўнік, каб даведацца (ці пераканацца), напрыклад, што* ***потырч*** *— гэта (у кантэксце) тварам уніз,* ***вершнік*** *— тое, што і коннік, верхавы,* ***трапкач*** *— ручнік з доўгімі махрамі і лупцоўка такім ручніком. Слова* ***мусова*** *(трэба разумець — хочаш не хочаш, а зрабіць трэба) у слоўніку няма, але ж гэта не значыць, што жыць яно не павінна, калі на Іўеўшчыне так гавораць?..*

*Каб вывучыць чужую мову, людзі праўду кажуць, дастаткова двух-трох гадоў, каб вывучыць сваю, родную, не хопіць жыцця: цяпер у рубрыцы «Алё, народ на провадзе» будзе яшчэ і адмысловы слоўнічак — з тлумачэннем рэдкаўжывальных слоў.*

**Уважаемые акционеры!**
**«Приорбанк» ОАО доводит до Вашего сведения информацию о**
**РАЗМЕРЕ И ПОРЯДКЕ ВЫПЛАТЫ ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ 2009 ГОДА**

Размер дивидендов по простым акциям составляет 695 рублей на акцию.

Размер дивидендов по привилегированным акциям составляет 1675 рублей на акцию.

Выплата дивидендов будет начата не позднее 1 апреля 2010 года.

**Телефон для справок: 8 (017) 289 90 90.**

Перечисление дивидендов производится на счета акционеров. Для их получения физическим лицам необходимо иметь при себе паспорт. Получение дивидендов за третьих лиц допускается при наличии доверенности. УНП 100220190.

## Музейны снарад мог дэтаніраваць самаадвольна

**Гэты факт канстатавалі супрацоўнікі сапёрна-піратэхнічнай групы 6-й асобнай спецыяльнай брыгады ўнутраных войскаў МУС, якія наведалі з праверкай музей Гомельскага дзяржаўнага прафесійна-будаўнічага ліцэя імя П.Я. Галавачова.**

Сярод боепрыпасаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны, якія захоўваліся ў экспазіцыі, 6 прызнаны небяспечнымі, а асабліва небяспечным з'яўляўся 45-міліметровы артылерыйскі снарад, які значна акісліўся, з дэтанатарам. Экспанаты — патэнцыйныя забойцы — былі знойдзены супрацоўнікамі ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці ў ходзе мерапрыемстваў, накіраваных на выяўленне фактаў захоўвання ў музеях баявой славы рэгіёна небяспечнай зброі. З пачатку 2010 года, па інфармацыі прэс-групы УКДБ па Гомельскай вобласці, з музейных экспазіцый рэгіёна і нелегальных прыватных калекцый канфіскаваныя: авіяцыйная гармата, 6 пісталетаў, 4 аўтаматы, кулямёт, вінтоўка, больш за 80 адзінак боепрыпасаў, агульная вага выбуховага рэчыва якіх складае больш за 2 кг у тратылавым эквіваленце. Усе прадметы знаходзіліся ў баявым стане. Сапёрна-піратэхнічная група вайсковай часці 5525 вывезла небяспечныя экспанаты за межы навучальнай установы і знішчыла іх.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении открытого аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций Горецкого открытого акционерного общества «Типография БГСХА».

Аукцион состоится **6 мая 2010 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Продавец – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Для участия в аукционе в срок **до 16.00 20 апреля 2010 г.** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный,12, каб. 401 предоставляются следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

**юридическими лицами** — резидентами Республики Беларусь — копии (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора — для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации, доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копия выданной Министерством финансов Республики Беларусь лицензии на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности на рынке ценных бумаг (профессиональными участниками рынка ценных бумаг);

**индивидуальными предпринимателями** – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации;

**представителями физических лиц, индивидуальных предпринимателей** – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенная доверенность;

**юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь** — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

**представителями физических лиц** — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность, представителями юридических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность или иные легализованные в установленном порядке документы, подтверждающие полномочия представителя.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предоставляют копию документа, удостоверяющего личность, и его подлинник для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Для участия в аукционе уплачивается задаток в сумме 2726260 (два миллиона семьсот двадцать шесть тысяч двести шестьдесят) белорусских рублей на счет № 3642974000028 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Задаток уплачивается в срок до 30 апреля 2010 г. согласно договору о задатке, заключаемому с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь при регистрации заявления на участие в аукционе.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее за пакет акций (лот) наиболее высокую цену.

Договор купли-продажи акций заключается с участником аукциона, выигравшим торги, в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Участник аукциона, выигравший торги, обязан возместить фактические затраты на подготовку и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Получить более подробную информацию о Горецком ОАО «Типография БГСХА», ознакомиться с проспектом эмиссии и годовой бухгалтерской отчетностью акционерного общества по состоянию на 1 января 2010 г., проектом договора купли-продажи акций можно по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401.

**Контактный телефон:**

Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (017) 284 85 62.

| Полное и сокращенное наименования открытого акционерного общества, его адрес | Уставный фонд, шт. акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Предлагается для реализации | | Начальная цена | | Лот № 1 | | Информация о владельцах крупных пакетов акций (5 и более процентов уставного фонда) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | кол-во акций, шт. | в % к УФ | кол-во акций, | в % к УФ | акции, рублей | пакета акций, рублей | количество акций в лоте, штук | начальная цена лота, рублей | |
| Горецкое открытое акционерное общество «Типография БГСХА» (Горецкое ОАО «Типография БГСХА»), Могилевская обл., г. Горки, ул. Тимирязева, 10 | 6204 | 1200 | 2819 | 45,4 | 2819 | 45,4 | 9671 | 27262549 | 2819 | 27262549 | Три физических лица (11,11 % УФ; 6,91 % УФ; 5,85 % УФ) |

За Горецким ОАО «Типография БГСХА» зарегистрирован земельный участок 0,1999 га в г. Горки.

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 26 марта 2010 года ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В МИНСКОМ РАЙОНЕ

**Адрес земельного участка:** Минский район, Щомыслицкий с/с, район д. Богатырево. **Кадастровый номер**: 623688000001000344. **Площадь земельного участка**: 1,0477 га. **Срок аренды:** 51 год. **Целевое назначение:** для строительства производственно-складских помещений. **Сумма убытков и потерь с/х производства:** 0 рублей. **Расходы по подготовке документации:** 986 786 белорусских рублей. **Начальная цена права заключения договора аренды** 63 833 доллара США.

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **26.03.2010 г. в 9.00.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов **22.03.2010 г.** Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток 18 000 000 белорусских рублей перечисляется на р\с 3641000233719, Отделение № 537, г. Минск ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается не состоявшимся в случаях если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков,

2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Краіна здароўя
Выпуск № 11 (180)

# ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ЛЯКАРСТВА АД КАДРАВАГА ДЭФІЦЫТУ Ў МЕДЫЦЫНЕ?

**Чаму аб'ёмы падрыхтоўкі спецыялістаў з медыцынскай адукацыяй у Беларусі пастаянна растуць, а залатаць «прарэхі» ў кадравым забеспячэнні галіны ніяк не ўдаецца? Ці можна пераадолець хранічны кадравы голад у першасным звяне? Як замацаваць маладых спецыялістаў на іх першым працоўным месцы? Куды ўвогуле сыходзяць кадры з медыцынскай галіны? Усе гэтыя пытанні ў чарговы раз узнімаліся ў сценах БелМАПА на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя нашай краіны.**

Пэўны час таму ў галоўным медыцынскім ведамстве спрабавалі скласці прыблізны «сцэнарый» на бліжэйшыя 5-6 гадоў: з улікам аб'ёмаў падрыхтоўкі спецыялістаў у медыцынскіх ВНУ, дэмаграфічных тэндэнцый і многіх іншых акалічнасцяў атрымлівалася, што патрэбы айчыннай сістэмы аховы здароўя ва ўрачэбных кадрах могуць быць задаволеныя да 2014 года. Праўда, рабілася агаворка, што ўлічыць абсалютна ўсе нюансы, якія могуць узнікнуць за гэты час, немагчыма. Між іншым, такія «нюансы» ўзнікаюць пастаянна. На некаторых з іх спынілася ў сваім выступленні на калегіі **старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя Алена БЕЛЬСКАЯ**.

Лідар галіновага прафсаюза канстатавала, што па забяспечанасці насельніцтва ўрачамі Беларусь займае лідзіруючыя пазіцыі ў свеце, аднак у першасным звяне кадравая сітуацыя па-ранейшаму застаецца вельмі напружаная. У 2009 годзе прырост колькасці ўрачоў па сістэме аховы здароўя склаў 738 чалавек, аднак гэта не знізіла нагрузку на працуючых урачоў, наадварот, каэфіцыент сумяшчальніцтва вырас і складае цяпер 1,41 стаўкі (у 2008 годзе — 1,39). Ва ўрачэбныя амбулаторыі і ўчастковыя бальніцы было размеркавана ўдвая больш выпускнікоў, чым у папярэднім годзе, пры гэтым укамплектаванасць пасадаў урачоў-тэрапеўтаў і ўчастковых педыятраў, а таксама ўрачоў агульнай практыкі ў лепшы бок не змянілася. У чым прычына?

У адрозненне ад многіх еўрапейскіх краін, дзе прафесія ўрача адна з самых высокааплатных, **у Беларусі «кошт» гадзіны працы медыцынскіх работнікаў складае ўсяго 4404 рублі, а гэта, між іншым, толькі 59,7 працэнта ад аплаты за гадзіну працы ў прамысловасці.** А работа непасрэдна ўрача, які нясе адказнасць за жыццё хворага чалавека, ацэньваецца ў 7322 рублі за гадзіну, што ніжэй за заробкі работнікаў прамысловасці, будаўніцтва, фізічнай культуры і спорту, банкаўскай сферы, работнікаў органаў дзяржаўнага кіравання, работнікаў навуковай сферы і навуковага абслугоўвання.

— Летась сярэднямесячная заработная плата работнікаў аховы здароўя была 772,8 тысячы рублёў, або 276 долараў ЗША, што складае 71,1 працэнта ад сярэдніх заробкаў у прамысловасці, — паведаміла Алена Бельская. — Пры гэтым упершыню за апошнія дзесяць гадоў рэальная заработная плата знізілася на 3,1 працэнта, хоць увогуле па народнай гаспадарцы зніжэнне склала 0,4 працэнта. І толькі ў Мінску быў адзначаны летась рост рэальных заробкаў работнікаў аховы здароўя на 1,4 працэнта, што з'яўляецца сведчаннем увагі да нашай галіны з боку сталічных уладаў. У сярэднім 30 працэнтаў маладых спецыялістаў звальняюцца пасля абавязковага тэрміну адпрацоўкі. Па звестках анкетавання, з агульнай колькасці тых, хто звольніўся летась, **50 працэнтаў планавалі працаўладкавацца ў дзяржаўныя арганізацыі, 10 працэнтаў — у прыватныя, 37,7 працэнта не паведамілі пра свае планы, а 2,3 працэнта агучылі свой намер паехаць працаваць за межы Беларусі**. Апошнія лічбы асабліва насцярожваюць, улічваючы сусветныя тэндэнцыі працоўнай міграцыі медыцынскіх работнікаў. Па ацэнках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, дэфіцыт медыцынскіх кадраў перавышае ў свеце цяпер 4,3 млн спецыялістаў. Рызыкну выказаць меркаванне, што для краін еўрапейскага рэгіёна існуе рэальная пагроза павелічэння адтоку ўрачоў і медыцынскіх сёстраў у краіны Еўрасаюза, тым больш што там існуюць спецыяльныя праграмы найму на працу медыцынскіх кадраў з краін-суседак з дапамогай у адаптацыі, вывучэнні мовы, найме жылля. У інтэрнэце ўжо сёння можна знайсці мноства падобных прапаноў з Польшчы, Чэхіі, Іспаніі і іншых краін.

Эксперты СААЗ канстатуюць, што працоўная міграцыя нагадвае сёння прынцып даміно. Польскія медыкі едуць працаваць у Германію, нямецкія ўрачы — у Вялікабрытанію, а англійскія ўрачы — у ЗША, Канаду, Аўстралію, Новую Зеландыю. У Германіі на ніве медыцыны «шчыруюць» урачы з Расіі, Ірана, Грэцыі, Аўстрыі, Турцыі, Румыніі, Украіны, Італіі. У Нарвегіі больш як 15 працэнтаў урачоў прыехалі з іншых краін, а ў Вялікабрытаніі і ўвогуле больш за 30 працэнтаў. Міграцыя — як вірус, перад якім нельга паставіць санітарны кардон. Дысбаланс у падрыхтоўцы медыцынскіх кадраў складваўся шмат гадоў. Заможныя краіны Еўропы недастаткова сродкаў укладвалі ў падрыхтоўку медыцынскіх кадраў і цяпер яны вымушаны цыраваць свае «кадравыя дзіркі» за кошт кадраў з краін з меншым узроўнем заробкаў. Да таго ж насельніцтва Еўропы імкліва старэе, што таксама павялічвае нагрузку на нацыянальныя сістэмы аховы здароўя. Калі ў 1992 годзе працягласць кансультацыі ўрача агульнай практыкі ў Англіі складала 8,5 хвіліны, то ў 2006 годзе — ужо 12 хвілін. І зусім не выпадкова ў Еўрасаюзе з'явілася ідэя ўвядзення для працоўных мігрантаў так званай «блакітнай карты», якая дае яе ўладальніку магчымасць працаваць на ўсёй прасторы Еўрасаюза і роўныя з грамадзянамі Еўрасаюза правы. З увядзеннем «блакітнай карты» Еўропа адкрывае свой рынак працы для высокакваліфікаваных спецыялістаў з іншых краін: у першую чаргу там чакаюць урачоў, інжынераў, спецыялістаў у галіне камп'ютарнай тэхнікі і навукоўцаў-даследчыкаў — тых, хто здольны ўнесці самы важкі ўклад у іх эканоміку.

Аднак, на думку старшыні прафсаюза, аплата працы з'яўляецца хоць і найважнейшым, аднак не адзіным стымулам для медыцынскіх работнікаў. Гэта, у прыватнасці, пацвердзілі і вынікі сацыялагічнага даследавання на тэму «Працоўная матывацыя і сацыяльны статус урача». Як высветлілася, **асноўная перашкода для выканання прафесійных абавязкаў, на думку ўрачоў, — празмерныя аб'ёмы работы з разнастайнай дакументацыяй (гэту прычыну назвалі 55 працэнтаў апытаных) і высокія нагрузкі (39,7 працэнта рэспандэнтаў). Прычым у 63,4 працэнта рэспандэнтаў работа з паперкамі і афармленнем дакументаў займае большую палову (!!!) іх працоўнага часу**.

— Гэтыя праблемы трэба разглядаць як арганізацыйныя ўпушчэнні, якія трэба пераадольваць, — падкрэсліла Алена Бельская. — Тэарэтычна скараціць папяровы дакументаабарот і павысіць эфектыўнасць работы медыцынскіх работнікаў павінна інфарматызацыя медыцынскай галіны. Прыклады паспяховага ўкаранення інфармацыйных тэхналогій і сапраўды ўжо ёсць. Напрыклад, у 2-й мінскай гарадской дзіцячай бальніцы камп'ютарызаванае кожнае працоўнае месца ўрача, кожны сястрынскі пост і кожнае структурнае падраздзяленне. Аднак у пераважнай большасці медустаноў дзейныя аўтаматызаваныя інфармацыйныя сістэмы скіраваныя, хутчэй, на забеспячэнне работнікаў аператыўнай і статыстычнай інфармацыяй і не аказваюць істотнай дапамогі ўрачу ў яго штодзённай рабоце. Таму нам самы час падумаць пра ўкараненне электроннай карты пацыента, прыклады выкарыстання якой ужо ёсць у нашых суседзяў.

Па стане на 1 студзеня 2010 года на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў стаялі 4047 урачоў і правізараў (з іх у сельскай мясцовасці працуюць 485) і 11 376 медработнікаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (2143 — у сельскай мясцовасці). З кола маладых спецыялістаў не забяспечаныя жыллём 604 урачы (70 з іх працуюць у сельскай мясцовасці) і 679 сярэдніх медработнікаў (160 — у сельскай мясцовасці). Цікава, ці надоўга маладыя спецыялісты затрымаюцца на першым працоўным месцы? Паляпшэння жыллёвых умоў чакаюць таксама 1400 супрацоўнікаў рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў, размешчаных на тэрыторыі Мінска. Па сёння не вырашана пытанне будаўніцтва інтэрната для РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава, нягледзячы на тыя абставіны, што ўчастак для будаўніцтва быў выдзелены яшчэ ў 2007 годзе. Разам з тым прыклады паспяховага вырашэння жыллёвых праблем работнікаў сістэмы аховы здароўя ёсць ва ўсіх рэгіёнах. У 2009 годзе ўрачам было выдзелена 29 службовых кватэр, а ў рэгіёнах маладым спецыялістам — 243 жылыя памяшканні.

— Мы спадзяёмся, што сітуацыя з забеспячэннем жыллём работнікаў медыцынскай галіны зможа палепшыцца ў выпадку падпісання ўказаў Прэзідэнта па гэтай праблеме, праекты якіх ужо падрыхтаваныя, — падкрэсліла Алена Бельская.

Алена Бельская паведаміла таксама, што ва ўрад накіраваныя канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні і павелічэнні аплаты працы работнікаў медыцынскай галіны. Зразумела, што **медыкі не разлічваюць у складаных эканамічных умовах зарабляць больш за ўсіх, аднак ніхто не будзе адмаўляць той факт, што заробкі медыкаў зусім не адпавядаюць сацыяльнай важнасці, напружанасці і адказнасці іх працы**. Абсалютна відавочна, што для сістэмы аховы здароўя павінна быць распрацаваная свая, адметная ад іншых сфераў сістэма аплаты працы, якая адлюстроўвала б спецыфіку працы медыцынскіх работнікаў і забяспечвала дыферэнцыяцыю ва ўзроўнях аплаты працы розных катэгорый работнікаў, з улікам іх прафесіяналізму, аб'ёмаў і складанасці работы, яе якасці і эфектыўнасці. За апошнія гады была здзейснена вялікая колькасць «кропкавых» павышэнняў заработнай платы асобным катэгорыям медыцынскіх работнікаў, аднак дзейная на сёння сістэма аплаты працы работнікаў аховы здароўя ў рамках адзінай тарыфнай сеткі і тарыфнай стаўкі першага разраду ўсё адно не дае магчымасці годна ацаніць напружанасць і адказнасць вельмі спецыфічнай работы медыцынскага работніка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### АПЛАТА ЗА ГАДЗІНУ ПРАЦЫ РАБОТНІКАЎ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ І ІНШЫХ ГАЛІН НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ Ў БЕЛАРУСКІХ РУБЛЯХ




**Лечымся з розумам**

## ХВОРЫМ НАГАМ ДАПАМОЖА БАГУН

Аблетыруючы атэрасклероз — дастаткова распаўсюджанае захворванне сасудаў ног. Яно сустракаецца як у мужчын, так і ў жанчын. Аднак пры гэтым мужчыны прыкметна лідзіруюць. Ва ўзроставай групе ад 40 да 70 гадоў такая паталогія ёсць прыкладна ў 3 % мужчын і 1 % жанчын. Пасля 70 гадоў хвароба рэгіструецца ў 10 % насельніцтва.

Пры першай стадыі захворвання пацыенты адзначаюць зябкасць, сутаргі ў ніжніх канечнасцях, часам паколванне ці смыленне ў кончыках пальцаў, павышаную стомленасць. Пры хаджэнні з хуткасцю 4-5 кіламетраў у гадзіну на адлегласць 500—1000 метраў узнікае перамежавальная кульгавасць. Яна заключаецца ў тым, што хворы пачынае адчуваць боль у ікраножных мышцах галёнкі ці ступні, і гэта прымушае яго спыняць хаду.

На другой стадыі інтэнсіўнасць перамежавальнай кульгавасці нарастае, яна ўжо ўзнікае пасля пераадолення адлегласці 200—250 м ці некалькі раней. Скура ступняў і галёнак губляе ўласцівую ёй эластычнасць, становіцца сухой, лушчыцца. Пачынае развівацца атрафія падскурнай тлушчавай клятчаткі і дробных мышцаў ступні.

Трэцяя стадыя характарызуецца з'яўленнем боляў у пашкоджанай канечнасці ў спакоі, хада становіцца магчымай толькі на адлегласць 25—50 м. Скура вытанчаецца і становіцца лёгкаранімай. Нязначныя траўмы ў выніку пацёртасцяў, удараў, стрыжкі пазногцяў прыводзяць да ўтварэння трэшчын і хваравітых язваў на паверхні нагі. Прагрэсуе атрафія мышцаў ступні і галёнкі.

На чацвёртай стадыі болі ў ступні і пальцах становяцца пастаяннымі і невыноснымі. Далучаецца ацёк ступні і галёнкі, развіваецца гангрэна пальцаў і ступняў.

Гэтае захворванне мае няўхільнае прагрэсаванне. Калі паталогію не лячыць, яна абавязкова прывядзе да страты канечнасці. Гэта толькі пытанне часу. Таму пацыентам, у якіх падазраецца такая паталогія, трэба пракансультавацца ў сасудзістага хірурга, каб вызначыцца з аб'ёмам лячэння. Акрамя таго хворым на аблетыруючы атэрасклероз неабходна прытрымлівацца і агульных правілаў. Гэта значыць сачыць за захаваннем дыеты, пры якой знізіць ужыванне тлушчаў жывёльнага паходжання. Прымаць прэпараты, якія зніжаюць халестэрын, сачыць за артэрыяльным ціскам. Рэкамендуецца 3-4 разы на год праходзіць курс вазаактыўнай тэрапіі, пры якой прымаюцца прэпараты, што валодаюць вазаактыўным эфектам. А галоўнае — выключыць курэнне. Статыстыка сведчыць, што сярод тых, хто кінуў курыць пасля паспяховай аперацыі на ніжняй канечнасці, 80 % пацыентаў на працягу 5 гадоў абыходзіліся без ампутацыі, а вось сярод тых, хто шкодную звычку не кінуў, 80 % праз 5 гадоў страчвалі нагу.

**Ёсць і народныя сродкі, якія прымяняюцца пры гэтай хваробе.**

- Узяць 2 ст. л. здробненай травы багуну, змяшаць з 5 ст. л. алею, настояць 12 гадзін на гарачай пліце (памешваючы), працадзіць. Ужываць для вонкавых уціранняў пры эндартэрыіце, рэўматызме, падагры.
- Вібрагімнастыка па метадзе А. Мікуліна. Яна ўхіляе назапашванне шлакаў і тромбы ля вянозных клапанаў. Падняцца на дыбачках на 1-2 см, рэзка апусціцца на падлогу ці зямлю. Рабіць няспешна, не часцей за 1 раз у секунду. Зрабіць 30 разоў, адпачыць. І зноў зрабіць столькі ж. На працягу дня такія практыкаванні рабіць 3—5 разоў.
- Лежачы на спіне, падняць рукі і ногі, патрэсці 1-2 хвіліны, вечарам і раніцай. Вынік будзе.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

### «Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

**16 сакавіка** — загадчык арганізацыйна-метадычнага, кансультатыўнага аддзела Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Мінкевіч К.М.

**17 сакавіка** — загадчык уралагічнага (андралагічнага) аддзялення № 2 Мінскай абласной клінічнай бальніцы Потап В.К.

**18 сакавіка** — загадчык арганізацыйна-метадычнага, кансультацыйнага аддзела Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Саладуха В.В.

**19 сакавіка** — загадчык філіяла № 1 Атолінскай бальніцы Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Грышук Н.Г.

**У графіку магчымыя змяненні.**

**Доктар адкажа**

## Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

**На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**16 сакавіка** — галоўны ўрач Рэспубліканскай дзіцячай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Галіна Мікалаеўна РАДЫЁНАВА.

**17 сакавіка** — галоўны ўрач Мінскага абласнога радзільнага дома Пётр Леанідавіч МАСЬКО.

**18 сакавіка** — галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Тамара Канстанцінаўна МАРТУСЕВІЧ.

**19 сакавіка** — намеснік дырэктара РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі Аксана Мікалаеўна РАМАНАВА.

**У графіку магчымыя змяненні.**

**Во даюць!**

## Анлайн-гульня пра... бяспечны сэкс

**Канадская арганізацыя грамадскага здароўя запусціла адукацыйную анлайн-гульню для падлеткаў пад назвай «Прыгоды ў горадзе сэксу».**

Сюжэт гульні, якая зроблена ў эстэтыцы коміксаў, у тым, што носьбіт розных інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам (ІППП), злы герой Спермінатар спрабуе заразіць усё насельніцтва горада. Гульцу прапануецца выбраць аднаго з чатырох супергерояў для барацьбы са злодзеем. Адзін з герояў — вучоны, які прысвяціў сваё жыццё стварэнню ідэальнага прэзерватыва. Другі — юнак, якога шмат дражнілі ў школе з-за нізкага росту і які пранікся спачуваннем да ўсіх, хто адрозніваецца ад іншых. Трэцяя гераіня — дзяўчына, якая верыць у каханне і прапаведуе ўстрыманне ад сэксу да шлюбу, і чацвёртая — маладая жанчына, якая вядзе актыўнае палавое жыццё і пасля вылячэння ІППП рэгулярна праходзіць абследаванні на гэтыя інфекцыі.

Герой, якога абярэ гулец, павінен адбіваць атакі Спермінатара шчытом, што з'яўляецца пры правільных адказах на пытанні па ІППП. Калі герой правільна адкажа на 25 пытанняў, Спермінатар вылечваецца. Акрамя таго, падчас гульні рэгулярна з'яўляюцца «маньякі міфаў», якія абвяргаюць распаўсюджаныя памылковыя меркаванні аб палавых інфекцыях.

Па словах аўтараў гульні, у стварэнні канцэпцыі бралі ўдзел 16 мясцовых тынэйджараў. З іх дапамогай былі знойдзены прыёмы, якія прыцягваюць увагу падлеткавай аўдыторыі. Інтэрактыўная навінка размешчана на сайце Арганізацыі грамадскага здароўя.

## Прадстаўнікі «сумных» прафесій жывуць менш?

**Як паведамляе The Daily Telegraph, маркотнае жыццё павышае ў людзей рызыку заўчаснай смерці амаль у паўтара раза.**

Да такой высновы прыйшла група брытанскіх даследчыкаў з Лонданскага Універсітэцкага каледжа (University College London). У поле зроку даследчыкаў трапілі 7524 працуючыя грамадзяніны ва ўзросце да 55 гадоў, якія ў сярэдзіне 80-х гадоў давалі ацэнку свайму жыццю. А ў 2009 годзе даследчыкі вырашылі высветліць, як жывуць удзельнікі даследавання? Аказалася, што рызыка заўчаснай смерці сярод тых, хто лічыў сваё жыццё сумным і нецікавым, на 40 працэнтаў перавышае аналагічны паказчык у групе людзей, якія давалі іншыя характарыстыкі свайму існаванню. Акрамя таго, даследчыкі высветлілі, што жанчыны ўдвая часцей за мужчын характарызавалі сваё жыццё як сумнае. Работнікі маладога ўзросту і менш кваліфікаваныя супрацоўнікі таксама часцей за іншых называлі свае жыццё маркотным. Даследчыкі сцвярджаюць, што людзі, якія адчуваюць нудоту, схільныя да злоўжывання алкаголем і курэння, што скарачае сярэднюю працягласць жыцця і з'яўляецца прычынай развіцця ў іх сардэчна-сасудзістых захворванняў. У сувязі з гэтым прадстаўнікам «сумных» прафесій медыкі раяць знайсці цікавы занятак, не звязаны з іх працай, які здольны настроіць іх на больш аптымістычны лад жыцця.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Глыбінка**

## Рыцары жалезнай гульні жывуць у Лельчыцах

### У гэтым райцэнтры падрыхтавана 54 майстры і 4 майстры спорту міжнароднага класа па цяжкай атлетыцы



Кандыдат у майстры спорту Алёша ТАРАСЕВІЧ рыхтуецца да ўдзелу ў спаборніцтвах.

— Аленка, пачынай!

Хударлявая дзяўчынка падыходзіць да штангі, на некалькі секундаў нібы замірае, засяроджваецца і рашуча ўскідвае гэту халодную бліскучую «штучку» на грудзі. Імгненне — і цяжкі метал узлятае над яе галавой.

— Малайчына! — хваліць дзяўчынку трэнер, а я здзіўляюся, адкуль у яе такі спрыт і сіла, каб так лёгка гуляць у гэтую жалезную гульню і перамагаць груду металу. Бо Аленцы няма яшчэ і чатырнаццаці гадоў і пры сваёй асабістай вазе ў 29 кілаграмаў яна штурхае штангу ў 52 кілаграмы, а трэніруючыся, прысядае з 70-кілаграмовай штангай.

У Лельчыцкай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву Алена Ляхавец займаецца ўсяго два гады, але ўжо ўдзельнічала ў некалькіх спаборніцтвах і паказвала годныя вынікі. Яна — кандыдат у майстры спорту, чэмпіёнка краіны ў сваёй узроставай групе. А прыйшла дзяўчынка сюды па прыкладзе сваёй старэйшай сястры Валянціны, якая, устанавіўшы тры рэкорды Рэспублікі Беларусь па цяжкай атлетыцы сярод дарослых, узнялася на вышэйшую прыступку п'едэстала, а на першынстве Еўропы ў Італіі (2007 год) заваявала тры медалі: два сярэбраныя — у рыўку і штуршку — і бронзавы — у штуршку. 2009 год прынёс ёй трэцяе прызавое месца на моладзевым першынстве Еўропы.

— Гэта толькі калі назіраеш збоку, здаецца, што спартсмену барацьба са штангай даецца лёгка, — кажа трэнер Мікалай Варановіч, калі мы закончылі ўжо назіраць за Аленкай. — Насамрэч, яму ці ёй даводзіцца прыкладваць максімум намаганняў, каб скарыць яе, прымусіць «капітуляваць» перад сілай і воляй чалавека.

У гутарку ўступае дырэктар СДЮШАР Юрый Паўлюк. Ён назваў даволі цікавыя факты. За мінулы год лельчыцкія штангісты заваявалі 16(!) медалёў на чэмпіянаце свету і Еўропы, 9 з якіх — залатыя. Казімір Фіцнер стаў чэмпіёнам свету і Еўропы сярод юніёраў, Мікалай Новікаў — прызёрам чэмпіянату Еўропы сярод дарослых, а Наталля Колас і Валянціна Ляхавец — прызёрамі першынства Еўропы. Тады ж падрыхтавана 2 майстры спорту міжнароднага класа, 4 кандыдаты ў майстры спорту, 6 першаразраднікаў, 8 членаў нацыянальных камандаў і столькі ж чэмпіёнаў краіны.

Нельга не сказаць і пра тое, чаго ў розны час дасягнулі і іншыя спартсмены, выхаванцы Лельчыцкай школы цяжкаатлетаў. На чэмпіянаце Еўропы і свету ў Славакіі і Швецыі Анатоль Серык і Сяргей Брухавецкі занялі адпаведна пятае і трэцяе месцы, а на чэмпіянаце свету ў Грэцыі Сяргей быў чацвёртым. Выхаванцы Лельчыцкай СДЮШАР паспяхова выступалі на памостах Албаніі, Італіі, Кітая, Іспаніі, Паўднёвай Карэі. Адным словам, россып талентаў. Але каб сярод звычайных хлопчыкаў і дзяўчатак, якія прыходзяць у СДЮШАР, вызначыць тых, хто можа падняцца на спартыўную вышыню, а потым і навучыць іх высокаму майстэрству, сіле духу, самому трэнеру неабходна валодаць талентам. Хто ж такі Мікалай Іванавіч Варановіч, галоўны трэнер усіх камандаў Гомельскай вобласці па цяжкай атлетыцы? Карэнны паляшук-ляльчук. Школу закончыў у райцэнтры, тры гады адслужыў у Паўночным флоце, а штангай пачаў займацца пасля арміі, калі паступіў вучыцца ў Віцебскі тэхнікум фізічнай культуры, які, дарэчы, закончыў з «чырвоным» дыпломам у 1974 годзе. Там жа, у Віцебску, ён і выканаў нарматыў майстра спорту, там жа і застаўся працаваць у добраахвотным спартыўным таварыстве «Буравеснік» і абласным савеце па фізкультуры і спорце.

Але праз два гады яго пацягнула на радзіму, у Лельчыцы. Пэўны час быў старшынёй раённага камітэта па фізкультуры і спорце, трэнерам ДСТ «Ураджай», а ў 1986 годзе закончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны па сваёй спецыяльнасці і ў 1986 годзе перайшоў працаваць у дзіцяча-юнацкую спартыўную школу.

— Як робіцца адбор вучняў у яе, — спытаў я ў яго, — як шукаеце таленты?

— Я з першай сустрэчы з хлопчыкам ці дзяўчынкай бачу, чаго хто варты, і ніводнага разу не памыліўся, — адказвае Мікалай Іванавіч. — Улічваецца не толькі фізічная сіла, але і псіхалагічная настроенасць, валявыя і разумовыя якасці. Акрамя таго, што мы робім набор у Лельчыцах, дык яшчэ са штангай выязджаем у суседнія Нараўлянскі, Ельскі і іншыя раёны. Мае выхаванцы, майстры спорту, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, працуюць у школах раёна, і яны таксама дапамагаюць у падборы навучэнцаў. Канкрэтны прыклад. У Буйнавічах фізрук мясцовай школы Сяргей Мазур параіў прыгледзецца да пяцікласніка Казіміра Фіцнера, які жыў з бабуляй. Яго бацька памёр, калі хлопчыку было ўсяго некалькі дзён, а маці ўдарылася ў спіртное. Была пэўная небяспека таго, што ён мог стаць на слізкую дарожку. Так здольны хлопчык апынуўся ў нас, і ў яго зараз выдатныя перспектывы.

Падкрэслім: Мікалай Іванавіч, жывучы ў Лельчыцах, гэтай палескай глыбінцы, з'яўляецца галоўным трэнерам дарослай і юнацкай камандаў Гомельскай вобласці па цяжкай атлетыцы. Ды і гэта яшчэ не ўсё. У школе акрамя яго штангістаў трэніруюць таксама чатыры майстры спорту: Юрый Тарасевіч, Аляксандр Лісіцкі і Варановічы — Юрый і Мікалай (сыны Мікалая Іванавіча).

Размаўляючы з Паўлюком і Варановічам, яшчэ раз узгадваеш мудрую народную прымаўку: пад ляжачы камень вада не цячэ. І гэта пацвярджаецца хоць бы тым, што спачатку штангісты займаліся ў будынку-хаціне, які яны жартоўна называлі «сакляй», бо ў ім не было належных умоў. Кіраўнік установы і трэнер паставілі пытанне перад мясцовымі органамі ўлады аб тым, каб ім было выдзелена іншае збудаванне, бо ў СДЮШАР (а яна яшчэ не мела статусу алімпійскага рэзерву) ужо з'явіліся спартсмены, якія ўваходзілі ў нацыянальную зборную краіны, і для росту іх спартыўнага майстэрства не было адпаведных умоў.

І вось у 1983 годзе кіраўнікі раёна пасадзейнічалі школе ў выдзяленні такога будынка, у якім, праўда, трэба было навесці парадак, зрабіць рамонт. Да вайны гэта быў Дом культуры, а падчас яе — нямецкая камендатура, пасля — камбінат бытавога абслугоўвання, гандлёвая ўстанова. Трэнеры і дзеці замянілі падлогу, паклалі плітку, пафарбавалі сцены, выканалі шэраг іншых работ, і будынак стаў зусім іншым, а ў 2005 годзе, калі дапамаглі фінансавымі сродкамі райвыканкам і аблвыканкам, быў зроблены еўрарамонт і будынак набыў цывілізаваны выгляд.

Сёння ў школе займаецца 452 чалавекі на двух аддзяленнях: цяжкай і лёгкай атлетыкі. У першым з іх — 109 хлопчыкаў і дзяўчат, і ў 2001 годзе за падрыхтоўку прызёраў першынства свету і Еўропы яна атрымала званне спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву. З таго часу тут падрыхтавана 54 майстры спорту і чатыры майстры спорту міжнароднага класа. І гэта, паўторымся яшчэ раз, у невялікім населеным пункце беларускай глыбінкі. Чым не прыклад для іншых гарадоў, у тым ліку і буйных?

Заняткі ў СДЮШАР па цяжкай атлетыцы праходзяць з 10 да 17 гадзін. Без перапынку. Адначасова трэніруюцца і майстры спорту-чэмпіёны, і навічкі. Юрый Іванавіч і Мікалай Іванавіч бачаць у гэтым толькі пазітыў. Бо слабейшыя вучацца ў найбольш спрактыкаваных. Дарэчы, у трэнажорнай зале якога толькі спартыўнага абсталявання няма. Навучэнцы школы, можна сказаць, сваёй працай, сваімі дасягненнямі зарабілі іх. Як? На рознага роду спаборніцтвах, у тым ліку і міжнародных, яны выступалі ў форме, на якой значыўся надпіс «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод». Тым самым ішла рэклама прадпрыемства, за што яно і падарыла спартсменам тое абсталяванне.

— Мікалай Іванавіч, Юрый Іванавіч, пра што вы марыце?

— Пра той час, калі ў школе будзе свой аўтобус. Бо цяпер нашым спартсменам вельмі цяжка з глыбінкі дабірацца на спаборніцтвы. Едзем спачатку да Калінкавічаў, а потым ужо ў Мінск, Гродна, Брэст і Віцебск, і атрымліваецца так, што даводзіцца прыязджаць і адразу, як кажуць, з карабля на баль, ці padoўгу марнуем час на вакзалах. Ад усяго гэтага дзеці стамляюцца. У 2012 годзе ў Лондане адбудуцца Алімпійскія гульні, і мы марым пра тое, каб нашы выхаванцы майстры спорту Наталля Колас і Валянціна Ляхавец там выступілі. Спадзяёмся, што Казімір Фіцнер і Мікалай Новікаў заваююць ліцэнзіі на ўдзел у Алімпійскіх гульнях і пакажуць там годны вынік. І што з Аленкі Ляхавец вырасце выдатная спартсменка.

— Мары высокага палёту, — кажу я.

— І рэальныя, — дапаўняюць мяне Юрый Іванавіч і Мікалай Іванавіч.

Дык няхай яны збудуцца! Ляльчукі заслугоўваюць гэтага.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**
**Фота Адама ЖОГЛЫ.**



Энергетыкі і настойлівасці ў Аленкі ЛЯХАВЕЦ хоць адбаўляй. Побач — настаўнік і трэнер лельчыцкіх штангістаў Мікалай Іванавіч ВАРАНОВІЧ.

**Інфарм-укол**

## ФІТАТЭРАПІЯ ДЛЯ ОРГАНАЎ СТРАВАВАННЯ

**Слізістую абалонку страўнікава-кішачнага тракта заклікаыны абараняць фітапрэпараты. Якія з іх якімі вартасцямі валодаюць, расказвае старшая медсястра аддзела прафілактыкі 18-й гарадской паліклінікі г. Мінска Валянціна БАБКО.**

Рамонак аптэчны, алтэя лекавая, мальва, падбел, фіялка трохкаляровая, лён пасяўны, бульба ўтрымліваюць слізь, а значыць, змякчаюць, абвалакваюць, адсарбіруюць прадукты жыццядзейнасці мікрафлоры кішэчніка, розныя атрутныя рэчывы. Слізь абараняе тканку ад знешніх раздражняльнікаў, змяншае боль, здымае спазмы.

Аер, алоэ, дзевясіл, святаяннік, трыпутнік, календула, крапіва, дуброўка, мята, кмен, чыстацел, шыпшына, эўкаліпт валодаюць у першую чаргу супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі, утвараюць на паверхні слізістай абалонкі абарончую плёнку.

Пры фітатэрапіі язвавай хваробы і гастрыту з павышанай сакрэцыяй салянай кіслаты выкарыстоўваюцца расліны з супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі (дуб, святаяннік, трыпутнік, календула, дзевясіл, крываўнік), антыспастычнымі (святаяннік, рамонак, мята, мацярдушка), паслабляльнымі (рэвень, крушына). Значна паскарае рубцаванне язвы свежы сок капусты, дзевясіл, акопнік, чыстацел, салодка.

Пры недастатковай актыўнасці залоз страўніка прымаюць лісце трыпутніку, палын, чабор, кмен, мацярдушку, пятрушку, мяту, крываўнік. Яны падаўляюць запаленчы працэс у слізістай абалонцы страўніка, стымулююць сакраторную функцыю страўніка. З гэтай жа мэтай рэкамендуюцца лімонны, таматны, журавінавы сокі, слабы раствор лімоннай кіслаты.

Шырока выкарыстоўваецца фітатэрапія пры лячэнні хранічных халецыстытаў. Жаўцягонным дзеяннем валодаюць кветкі крываўніку, кукурузныя рыльцы, пятрушка, мята. Выдзяленню жоўці, скарачэнню жоўцевага пузыра спрыяюць настойка лісця барбарысу, адвар піжмы, сланечнікавы, абляпіхавы, аліўкавы алей. Для расслаблення тонусу жоўцевых шляхоў выкарыстоўваецца трава дуброўкі гусінай, чыстацелу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ПОГЛЯД НА ВЯЛІКІ З ВЫШЫНІ ПАСАДЫ


Фота БЕЛТА.

**Пасля таго, як оперная і балетная трупы тэатра пераўжылі капітальны рамонт паасобку, ім прыходзіцца вучыцца наноў існаваць пад адным дахам і прыстасоўвацца да новых умоў працы на мадэрнізаванай сцэне, улічваючы ўсе акустычныя асаблівасці залы, каб глядач застаўся задаволены якасцю таго, што бачыць і чуе. Што для гэтага патрэбна? І хто будзе адказваць?..**

### За творчасць

— Адносна мастацкага кіраўніка тэатра — такой пасады няма, — сказаў генеральны дырэктар Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Уладзімір Грыдзюшка. — У нас ёсць пасада мастацкага кіраўніка балета, ім прызначаны Юрый Траян, які ў 29 гадоў стаў народным артыстам Беларусі, шмат танцаваў на гэтай сцэне. Але пастаноўшчык опер кіраваць балетам не можа, гэтак жа як і наадварот. Ёсць галоўны рэжысёр оперы, кіраўнік балета, якія маюць прамыя адносіны да аднаго калектыву і другога. У нас ёсць музычнае кіраўніцтва — гэта прэрагатыва галоўнага дырыжора. Мы сёння маем нармальных прыезджых рэжысёраў, якія ставяць спектаклі. І ў нас ёсць свае рэжысёры, якія таксама ставяць спектаклі. Мы не хочам зрабіць зараз памылку, калі будзем прызначаць кіраўніка оперы. Пройдзе адзін спектакль, другі, а потым я прыму адпаведнае рашэнне, каго прызначыць галоўным рэжысёрам оперы. Магчыма, гэта будзе чалавек з Масквы ці з Піцера, ці наш чалавек. Але мы вызначымся дастаткова хутка па кандыдатуры галоўнага рэжысёра Беларускай оперы.

### За выкананне

— У нас цудоўныя трупы салістаў оперы і балета. Наш сімфанічны аркестр такі, што можа пазайздросціць любы сімфанічны аркестр у іншым тэатры свету. Наш хор — таксама ў іншых тэатрах выклікае зайздрасць. У нас салісты высокага ўзроўню, шмат маладых, якія маюць патэнцыял, — упэўнены Уладзімір Грыдзюшка. Але... — У нас ёсць вялікая трупа салістаў оперы. Для параўнання — у Варшаўскім тэатры 17 чалавек, у Латвійскім — 25 чалавек, у Вялікім тэатры Расіі — 55 чалавек. Таму мы будзем думаць пра тое, каб цягам часу правесці атэстацыю салістаў. Ёсць разуменне з кіраўнікамі труп, з салістамі. Аптымальная лічба — 40 чалавек, каб мець магчымасць паставіць на галоўныя партыі сваіх салістаў і запрашаць іншых. Мы будзем працаваць над прыцягненнем салістаў высокага ўзроўню на кантрактнай аснове. Напрыклад, ёсць неабходнасць на кантрактнай аснове Ірыну Макараву запрасіць, ці Юрыя Нячаева з Вялікага тэатра Расіі. Мы абгаварылі з імі тыя партыі, якія яны спяюць, за кожны выхад на сцэну пэўную суму плацім — вось якія магчымасці дае кантрактная форма. У перспектыве прымяняць яе мае сэнс у дачыненні да тых, каго мы хочам запрасіць. Напрыклад, хочам зрабіць галоўным рэжысёрам запрошанага чалавека — мы з ім заключылі кантракт на год, ён паставіў некалькі спектакляў і з'ехаў. Пацiснулі рукі адзін аднаму, сказалі дзякуй...

### За гук

— Акустыка — не такое простае пытанне. Акустыка, якая была ў Вялікім тэатры, не пагоршылася, а палепшылася, — сцвярджае Уладзімір Грыдзюшка, які асабіста курыраваў рэканструкцыю тэатра і некалькі месяцаў таму быў прызначаны яго генеральным дырэктарам. — Першы час узнікалі пытанні наконт акустыкі з-за таго, што нехта не мог прыстасавацца. Гэта натуральна. Прывыкаць да добрага не так проста. Важна было знайсці баланс паміж аркестравай ямай і сцэнай. Паміж салістамі і хорам. А каб дамагчыся ідэальнай акустыкі, трэба было пабудаваць новы тэатр у адпаведнасці з тымі нарматывамі, якія існуюць. А дзеля гэтага трэба было столь на чатыры метры апусціць, суадносіны глыбіні і вышыні ложаў бенуара і бельэтажа ў два разы паменшыць... Трэба было цалкам перакроіць усю глядацкую залу і павялічыць колькасць месцаў. Напрыклад, у Вялікім тэатры Расіі на столькі ж кубічных метраў — 2 з паловай тысячы месцаў, у нас — 1200 месцаў. Але тым не менш мы ўсё адно ўдасканальваем акустычныя дадзеныя. На іх уплываюць нават дэкарацыі. Падчас рэканструкцыі прымененыя аздабленчыя матэрыялы высокіх акустычных якасцяў — абіўка крэслаў; тынкоўка столі. Адразу, калі ўзнікла гэта пытанне, было зроблена вымярэнне акустычных уласцівасцяў, вынікі былі станоўчыя. Салісты, якія былі ў мяне ў кабінеце, казалі, што калі нашу акустыку параўноўваць з Вялікім тэатрам Расіі — ніякіх параўнанняў. Пра «Ла Скала» казалі, што там ёсць адзін пункт, і калі разыгрываюцца мізансцэны, салісты імкнуцца патрапіць на яго, каб іх з усіх бакоў глядацкай залы было аднолькава добра чуваць.

### За супрацоўніцтва

— Вядзём перамовы з Марынай Гулегінай, каб выступіла ў Мінску. Я паслухаў яе выкананне на ўрачыстай цырымоніі закрыцця Алімпіяды, напісаў ёй ліст і папрасіў знайсці магчымасць прыехаць. Цяпер атрымаў ад яе адказ, які абнадзейвае: у верасні можа адбыцца яе сольны канцэрт. Пытанне ў фінансаванні. Грошы, несумненна, патрэбны вялікія. Я цяпер думаю над тым, якім чынам іх знайсці. Гэта павінны быць не бюджэтныя сродкі. Безумоўна, каб акупіць выдаткі натуральным чынам, без прыцягнення спонсарскіх сродкаў, цана квітка павінна быць высокай. А нам хацелася б, каб яна не была высокай...

### За і ад сябе:

Слухала і думала: колькі мастацтва цяпер нам абяцаюць — і толькі ў найлепшай якасці. Усё дзеля таго, каб просты глядач меў магчымасць далучыцца да вяршыняў творчасці! Так, мы заслужылі, таму што перачакалі гэты доўгі рамонт, заплаціўшы за яго: бо дзяржава — гэты мы. Мы заслугоўваем і зараз, калі чакаем, што тэатр запрацуе на поўную моц, не толькі аднаўляючы спектаклі з былога рэпертуару, ці рэстаўруючы пастаноўкі, якія наўрад ці можна лічыць састарэлымі — хочацца верыць, што таксама з-за патрэбаў новай сцэны. Але і гэта за наш кошт — з бюджэту. Безумоўна, добра мець у год Шапэна адноўленую балетную пастаноўку «Шапеніяна». Ці адноўленую оперу «Аіда», якая была ў рэпертуары шмат гадоў таму. На заканчэнне сезона нам абяцаюць «Хаваншчыну» — оперу, якая была пастаўлена не так даўно, акурат напярэдадні рамонту, але таксама яе ўжо рэстаўруюць. Як ужо паказалі нам балет «Лебядзінае возера» — таксама нельга сказаць, што надта стары — аднак у новых дэкарацыях і касцюмах. А гэта, як прызнаецца генеральны дырэктар, — усё каласальныя сродкі. Хочацца верыць у тое, што ёсць сэнс у гэтых выдатках. І хочацца верыць, што калі бяруць іх з нашай кішэні, то ўсё дзеля нас.

Так, нам абяцаюць: тэатр будзе працаваць дзеля гледача. І нават калі трэба імкнуцца да самаакупляльнасці, то дзеля нас, вялікіх аматараў оперы і балета, тэатр будзе шукаць магчымасць зрабіць кошты на квіткі даступнымі. Мастацтва павінна належаць народу! Прынамсі, у Беларусі. Аднак дзеля гэтага збіраюцца выкарыстоўваць міжнародны досвед: ствараць апякунскі савет, у які б увайшлі прадстаўнікі бізнэсу. Натуральна, грошы сёння вырашаюць шмат. Яны патрэбны не толькі на новыя пастаноўкі, але і на арганізацыю ў нас гастроляў іншых тэатраў свету ды іх салістаў, што абяцае рабіць кіраўніцтва Вялікага тэатра Беларусі. Аднак ён нам дарагі ў першую чаргу тым, што свой, а значыць не мае права на прахадныя пастаноўкі, на якія хатняя публіка ўсё адно будзе хадзіць, бо надта доўга не была ў гэтым тэатры.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


Фота Пятра ФАМІНА.

Радавыя Перамогі

# ЯК ЛЮБА КРАХ «САТУРНА» НАБЛІЖАЛА

Калі грымнула вайна, Люба з двума малымі дзецьмі апынулася на Барысаўшчыне. Тут яна ўладкавалася на працу кухарам у аўтамайстэрні пры нямецкай часці. Пазней высветлілася, што гэта была няпростая вайсковая часць...

«Працаваць у разведшколе «Сатурн» я пачала ў лістападзе 1941 года, — узгадвала Любоў Яфімаўна Матусевіч. — З самага пачатку кінулася ў вочы, што на аўтамайстэрню гэта не надта падобна. Хутка пазнаёмілася з дзеншчыкам начальніка школы Васілём. Ён і расказаў, што гэта нямецкая школа, дзе рыхтуюць разведчыкаў для засылкі ў тыл Чырвонай Арміі».

Барысаўская разведшкола знаходзілася ў падпарадкаванні «Абверкаманды-103» армейскай групіроўкі «Ітэ», што дзейнічала ў кірунку галоўнага ўдару на Маскву. Размяшчалася ў ваенным гарадку Печы пад Барысавам. Штаб і вярбуючыя пункты знаходзіліся ў Мінску. Радыёпазыўнымі школы было слова «Сатурн».

